5. История рабочего класса БССР. Минск, 1984. Т. 1.
6. Біч, М. У змаганні за лепшую долю // Полымя. 1966. № 8. С. 132–138.
7. Шлюбскі, А. Да гісторыі БСГ // Полымя. 1925. № 5. С. 157–163.
8. Минское слово. 1907. № 160.
9. Бурбіс, А. Беларуская сацыялістычная грамада ў першым перыядзе яе працы (1903–1907) // Беларусь. Зборнік. Менск:, 1924. С. 177–181.

**УДК 94 (476) «1861/1862»**

# ПРЫКЛАДЫ ВЫКАРЫСТАННЯ ПОЛЬСКАМОЎНЫХ АДОЗВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У 1861–1862 гг.

***Д.У. Лішай***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex.ru*

Разглядаюцца асаблівасці выкарыстання польскамоўных антыўрадавых адозваў на тэрыторыі беларускіх губерняў у 1861–1862 гг. Зыходзячы са зместу агітацыйных матэрыялаў, акцэнтуецца ўвага на наяўнасці ідэй сумеснага ўзброенага выступлення насельніцтва Царства Польскага і зямель былога Вялікага Княства Літоўскага супраць расійскіх улад. Падкрэсліваецца заангажаванасць вучняў мясцовых гімназій у пратэсны рух. Прасочваюцца агульныя матывы ў закліках да барацьбы як у перыяд актывізацыі паўстанцкага руху ў 60-я гг. XIX ст., так і падчас польска-савецкай вайны 1919–1921 гг.

***Ключавыя словы:*** *польскамоўныя адозвы; антыўрадавая агітацыя, вучні гімназій; паўстанне, губерня.*

# ПРИМЕРЫ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ ПОЛЬСКОЯЗЫЧНЫХ ВОЗЗВАНИЙ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ В 1861–1862 гг.

***Д.В. Лишай***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, lishaiy-d96@yandex.ru*

Рассматриваются особенности использования польскоязычных антиправительственных воззваний на территории белорусских губерний в 1861–1862 гг. Исходя из содержания агитационных материалов, акцентируется внимание на наличии идей совместного вооруженного

выступления населения Царства Польского и земель бывшего Великого Княжества Литовского против российских властей. Подчеркивается вовлеченность учащихся местных гимназий в протестное движение. Прослеживаются общие мотивы в призывах к борьбе как в период активизации повстанческого движения в 60-е гг. XIX в., так и во время польско-советской войны 1919–1921 гг.

***Ключевые слова:*** *польскоязычные воззвания; антиправительственная агитация; ученики гимназий; восстание; губерния.*

## EXAMPLES OF THE USE OF POLISH-LANGUAGE PROCLAMATIONS ON THE TERRITORY OF BELARUSIAN PROVINCES IN 1861–1862

***D. Lishai***

*Belarusian State University, 4, Niezaliežnasci Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus, lishaiy-d96@yandex.ru*

The article examines the peculiarities of the use of Polish-language anti-government proclamations on the territory of Belarusian provinces in 1861–1862. Proceeding from propaganda material content, attention is focused on the existence of ideas of a joint armed uprising of the population of Congress Poland and the lands of the former Grand Duchy of Lithuania against the Russian government. The involvement of students of local gymnasiums in the protest movement is emphasized. The article also highlights similarities in calls for action both during the rise of insurgency in 1860's and the Polish-Soviet War of 1919–1921.

***Keywords:*** *Polish-language proclamations; anti-government agitation; gymnasium students; insurgency; province.*

Сёлета спаўняецца 100 год з даты падпісання Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. паміж РСФСР і Польскай Рэспублікай. Варта адзначыць, што вытокі супрацьстаяння гэтых дзяржаў неабходна разглядаць з улікам разнастайных аспектаў іх грамадска-палітычнага жыцця яшчэ з канца XVIII–XIX стст., якое непасрэдным чынам уплывала на Беларусь. Яно было шчыльна звязана з паўстанцкім рухам, што выявіўся ва ўзброеных выступленнях у 1794 г., 1830–1831 гг. і 1863–1864 гг. Пасля падаўлення апошняга паўстання палітыка расійскіх улад у дачыненні да польскага руху на беларускіх землях змянілася кардынальным чынам. На заканадаўчым узроўні быў уведзены шэраг абмежаванняў і забарон. Але і ў асяроддзі прадстаўнікоў польскага

нацыянальнага руху адбыліся пэўныя змены. Акрамя планаў па падрыхтоўцы паўстання, пашыраліся ідэі «арганічнай працы».

З пачаткам польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. важнае значэнне набываў ідэалагічны аспект. Актыўна выкарыстоўваліся агітацыйныя матэрыялы, аўтары якіх планавалі заручыцца падтрымкай з боку мясцовага насельніцтва. Адным са сродкаў барацьбы станавіліся плакаты з заклікамі. Напрыклад, для сялянскай аўдыторыі ўхіл рабіўся на зямельнае пытанне, а адзін з вядомых польскіх плакатаў 1920 г. змяшчаўся прамы заклік да ўзброенай барацьбы «Hej, kto Polak, na bagnety!» [1, с. 225–228].

Адметна, што актыўнае выкарыстанне польскамоўнай агітацыі мела месца яшчэ за 60 гадоў да пачатку польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. Гэта адбывалася падчас маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг., што стаў папярэднім этапам паўстання 1863–1864 гг. Змест агітацыі заключаўся ў прамым звароце да мясцовага насельніцтва, у якім нагадвалася пра важнасць ушанавання памяці пра Рэч Паспалітую, змаганне за аднаўленне яе гістарычных традыцый. Нягледзячы на значную ролю, якую адыграў гэты этап для развіцця грамадска-палітычнага жыцця рэгіёна, паўнавартаснае асвятленне тэмы адсутнічае. Напрыклад, погляды на беларускае пытанне як асобных прадстаўнікоў, так і цэлых арганізацый польскага нацыянальнага руху яшчэ патрабуюць належнага асвятлення. З гэтага вынікае, што распрацоўка заяўленай тэмы будзе садзейнічаць актуалізацыі важных пытанняў гісторыі Беларусі.

Пры разглядзе тэмы аналізаваліся даследаванні А.Э. Сакольчык (Фірыновіч) [5–6], А.І. Мілавідава [2]. База крыніц прадстаўлена матэрыяламі афіцыйнага справаводства і грамадска-палітычнай публіцыстыкай з фонду 295 «Канцылярыя мінскага грамадзянскага губернатара» Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі [3]. Таксама вывучаліся дакументы афіцыйнага справаводства, што былі апублікаваны ў тэматычным зборніку, прысвечаным рэвалюцыйнай сітуацыі ў 1861–1862 гг. на тэрыторыі беларуска-літоўскіх губерняў. Гэта данясенні штаб-афіцэра Корпуса жандараў Б.К. Рэйхарта, капітана Корпуса жандараў М.М. Чырванюка, віцебскага жандарскага-штаб афіцэра І.К. Турцэвіча, выконваючага абавязкі віцебскага грамадзянскага губернатара А.С. Аголіна, рапарт мазырскага гараднічага

М.Ф. Фёдарава [4]. Выяўленчыя крыніцы прадстаўлены агітацыйнымі плакатамі часоў польска-савецкай вайны 1919–1921 гг. [1].

У маніфестацыйны перыяд 1861–1862 гг. адной з самых пашыраных форм антыўрадавага руху стала распаўсюджванне матэрыялаў забароненага зместу на польскай мове. Так, у сакрэтным данясенні капітана Корпуса жандараў М.М. Чырванюка на імя шэфа Корпуса жандараў В.А. Даўгарукава ад 15 лістапада 1861 г. паведамлялася пра вынікі праведзенага вобыску на кватэрах вучняў землямерна-таксатарскіх класаў пры губернскай гімназіі Віцебска. 4 лістапада 1861 г. адбылася праверка вучняў С. Сямашкі, Р. Зялянко, Э. Чыжэўскага, А. Астроўскага, якія падазраваліся ў антыўрадавай дзейнасці. У іх былі знойдзены забароненыя сачыненні на польскай мове, адрасаваныя розным сацыяльным групам: адозвы «Польскай моладзі», памешчыкам «Літвы і Русі», адозвы да жанчын і каталіцкага духавенства, «Мазурка» У. Сыракомлі, а таксама пракламацыі з інфармацыяй пра пагадненні паміж дзеячамі італьянскага і польскага нацыянальнага рухаў Д. Гарыбальдзі і Л. Мераслаўскім [4, с. 584–585].

У сакрэтным рапарце мазырскага гараднічага М.Ф. Фёдарава на імя кіраўніка Мінскай губерні Э.Ф. Келера ад 7 снежня 1861 г. адзначалася, што ў Мазыры таксама зафіксаваны антыўрадавыя здарэнні. Так, у ноч з 2 на 3 снежня на брамах мясцовых гімназіі і рымска-каталіцкага касцёла былі змешчаны тэксты верша пад назвай «Do Gimnazistow Mozyrskich!» («Да мазырскіх гімназістаў!») У змесце твора Польшча паўставала ў вобразе гаротнай маці, а гімназісты былі яе дзецьмі. Аўтар тэксту з дакорам звяртаецца да навучэнцаў, падкрэсліваючы неналежны стан, у якім мусіць існаваць Польшча. Твор завяршаецца спадзяваннем на тое, што сыны (гімназісты) пойдуць бараніць сваю маці (Польшчу) ад ворага [3, арк. 2].

29 сакавіка 1862 г. у сакрэтным данясенні жандарскага штаб-афіцэра І.К. Турцэвіча на імя шэфа Корпуса жандараў В.А. Даўгарукава паведамлялася, што каля 7 гадзін раніцы 28 сакавіка ў Віцебску паліцэйскімі чыноўнікамі быў зафіксаваны факт антыўрадавай дзейнасці. У цэнтры горада невядомыя асобы вывесілі сцяг з заклікам да ўзброенай барацьбы. Маёр І.К. Турцэвіч прывёў наступнае апісанне прадмета: «Флаг этот сделан из белого коленкора и на нем надпись чернилами на польском языке: «Do broni, bracia, już czas nadchodzi». Надпись имеет сходство с обыкновенною печатью» [4, с. 586]. Расійскія

ўлад падазравалі ў гэтай акцыі віцебскіх гімназістаў, якія раней актыўна праяўлялі сябе ў разнастайных антыўрадавых выступленнях. Аднак выявіць вінаватых у гэтай справе не атрымалася. Маёр І.К. Турцэвіч падкрэсліў, што кіраўніцтву гімназіі для спынення радыкалізацыі настрояў неабходна надзяліць большую ўвагу нагляду за навучэнцамі [4, с. 586–587].

Зварот на польскай мове да мазырскіх гімназістаў, а таксама падазрэнні расійскіх улад у антыўрадавай заангажаванасці віцебскіх гімназістаў сведчаць пра жаданне арганізатараў хваляванняў бачыць у якасці сваёй мэтавай аўдыторыі вучнёўскую моладзь. Вядомы рускі гісторык і сучаснік падзей А.І. Мілавідаў у брашуры, прысвечанай удзелу вучнёўскай моладзі ў паўстанцкім руху 60-х гг. XIX ст. адзначаў наступнае: «Школа Северо-Западного края описываемой эпохи, будучи польской по составу учительского персонала, служа по своему духу и традициям, отражением школы Чарторыйского и его сподвижников, была более польской, чем русской и в учебной своей части. Не говоря о том, что преподаватели-поляки своим урокам (особенно по истории и литературе) давали националистическую окраску, говорили больше о Польше, чем о России (к чему были преспособлены и самые учебники), в стенах учебных заведений широкое применение нашел польский язык» [2, с. 15].

У сакрэтным данясенні выконваючага абавязкі віцебскага грамадзянскага губернатара А.С. Аголіна міністру ўнутраных спраў П.А. Валуева ад 2 чэрвеня 1862 г. адзначалася, што ў двараніна У. Франкоўскага знойдзены шэраг забароненых сачыненняў на польскай мове, у якіх быў змешчаны заклік да ўзброенага паўстання [5, с. 592–593].

Такім чынам, падчас маніфестацыйнага перыяду 1861–1862 гг., калі ішла актыўная падрыхтоўка да паўстання 1863–1864 гг., у шэрагу гарадоў беларускіх губерняў пачалі з’яўляцца польскамоўныя агітацыйныя матэрыялы антыўрадавага зместу. Грамадска-палітычная публіцыстыка ўтрымлівала заклікі да мясцовых жыхароў узняцца на ўзброеную барацьбу супраць расійскіх улад. Падпольныя матэрыялы адлюстроўвалі падзеі часоў Рэчы Паспалітай, тым самым падкрэсліваючы гістарычную сувязь Царства Польскага і зямель былога Вялікага Княства Літоўскага. З гэтым актыўна змагаліся расійскія ўлады ў 1861–1862 гг., а ў 1919–1921 гг. – савецкія ўлады.

Сацыяльнай базай пратэсных акцый станавілася вучнёўская моладзь. Звесткі з крыніц даюць магчымасць казаць, што да распаўсюджвання агітацыйных матэрыялаў на тэрыторыі беларускіх губерняў мелі дачыненне прадстаўнікі польскіх паўстанцкіх структур.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Балахоўцы: сведчанні. Дакументы. Даследаванні / [пераклад, прадмова, каментарыі А. Вашкевіча, А. Чарнякевіча, Ю. Юркевіча]. 2-е выд., дапоўненае і перапрацаванае. Смаленск: Інбелкульт, 2014.

2. Миловидов, А. И. Участие молодёжи северо-западного края в мятеже 1863 года и вызванная им реформа местных учебных заведений. Вильно, 1904.

3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 1430.

4. Революционный подъем в Литве и Белоруссии в 1861–1862 гг.: материалы и документы / В. Дьяков [и др.]; под общ. ред. В. Дьякова. М.: Наука, 1964.

5. Фірыновіч, А. Э. Паўстанне 1863–1864 гг.: вядомыя і невядомыя крыніцы беларускіх архіваў. Мінск : Беларус. навука, 2013.

6. Фірыновіч, А. Э. Выяўленчыя матэрыялы па гісторыі паўстання 1863–1864 гг. з Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі //Актуальные проблемы источниковедения : материалы междунар. науч.-практ. конф. к 135-летию со дня рождения В. И. Пичеты, Минск-Витебск, 9–11 октября 2013 г. Витебск : ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. С. 185–188.



**УДК 94(476)|654|**


# УСПАМІНЫ МЕЧЫСЛАВА ПАРОЎСКАГА ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ ПАЧАТКУ XX ст.


***В.С. Макарэвіч***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, makarevich.bsu.79@gmail.com*



У артыкуле разглядаецца змест успамінаў аднаго з вартых увагі ўдзельнікаў грамадска-палітычнага жыцця Беларусі пачатку XX стагоддзя, супрацоўніка Мінскага таварыства сельскай гаспадаркі, польскага таварыства “Асвята” – Мечыслава Пароўскага. Адлюстраваны змест асноўных сюжэтных ліній, дадзена характарыстыка крыніцы.



***Ключавыя словы:*** *мемуарыстыка; успаміны; гістарычныя крыніцы; М. Пароўскі; гісторыя Беларусі.*